системы «СВТ», автомат системы «ППД») использовались 45-мм противотанковые пушки, 76-мм полковые пушки, 122-мм гаубицы, 50-мм и 82-мм минометы, станковые пулеметы «Максим», счетверенная зенитная пулеметная установка «Максим» на автомашине ЗИС, бронеавтомобиль БА-10.

После войны объекты 68-го Гродненского укрепленного района оказались в пограничной зоне и стали труднодоступными для изучения. Если учесть и тот факт, что документы Управления укрепленных районов Генерального штаба Красной армии были засекречены и недоступны исследователям, то понятны трудности в исследовании этого памятника фортификации. Мы выражаем благодарность офицерам и солдатам Гродненского пограничного отряда РБ и Подляшского отдела Пограничной стражи РП за помощь, оказанную нам при проведении полевых исследований объектов 68-го Гродненского укрепленного района.

1. В июне 1941 г. Воспоминания участников первых боев на Гродненщине / Редактор и ответ. за выпуск Р.И. Карачун. – Гродно, 1997. – 286с.
2. Российский государственный военный архив (РГВА) – Фонд 36967. – Опись 1. – Дело 210.
3. РГВА – Фонд 36967. – Опись 1. – Дело 213.

**Лабоха Г.М.**

## ДА ПЫТАННЯ АДНАЎЛЕННЯ ДЗЕЙНАСЦІ СПАСА-ЕЎФРАСІННЕЎСКАГА ЖАНОЧАГА МАНАСТЫРА ПАД АХОВАЙ ПРАВАСЛАЎНАГА ВЕДАМСТВА (1832–1841)

Полацк, Рэспубліка Беларусь

Аднаўленне Спаса-Праабражэнскага храма адбылося раней за станаўленне Еўфрасіннева манастыра. Неабходныя сродкі на рэканструкцыю гістарычнага цэнтра манастырскага ансамбля – Спаса-Праабражэнскай царквы – былі сабраны епіскапам Віцебскім і Магілёўскім Гаўрыілам, пад кіраваннем якога знаходзілася Полацкая епархія ў перыяд з 1831 па 1833 гады. На той час на тэрыторыі Віцебскай губерні не дзейнічаў ніводны жаночы манастыр. Пачынаючы з XII стагоддзя, загараднае мястэчка Сяльцо было асвечана інацкім подзвігам прападобнай Еўфрасінні, якая заснавала там жаночы манастыр і стала яго першай ігменняй. Гаўрыіл прадставіў сваю прапанову аб адраджэнні абіцелі Св. Сіноду.

Азнаёміўшыся з гісторыяй манастыра, епіскап Гаўрыіл прапанаваў цалкам яго адрадзіць у першапачатковым выглядзе. «За надлежащим устройством» Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра ўладыка Гаўрыіл меў намер перанесці мошчы полацкай ігуменні з

Репозиторий ВГУ

Кіеўскіх пячор пад ахову муроў Спаса-Праабражэнскага храма, вярнуць Эфескі абраз Прасвятой Багародзіцы з Тарапецкага сабора і Крыж прападобнай Еўфрасінні, зроблены па яе даручэнню майстрам-ювелірам Лазарам Богшай. Па словах даследчыка Д. Даўгялы, праект Праасвяшчэннага Гаўрыіла стаў лебядзінай песняй яго кароткага знаходжання на полацкай кафедры [1, с. 44].

Падчас агляду епархіі ўладыка Гаўрыіл наведаў Полацк, каб асабіста азнаёміцца са Спаса-Праабражэнскай царквой: «…церковь Спаса находилась в крайнем запустении. Крыша была покрыта местами черепицей, местами соломой. На стенах храма находилось несколько полинявших икон преподобной Евфросинии, св. Параскевы, архангела Михаила и Преображения Господня…» [10, с. 24]. Занепакоены заняпалым становішчам унікальнага архітэктурнага твора, Гаўрыіл звярнуўся да віцебскага генерал-губернатара князя Ю. Хаванскага з хадайніцтвам аб перадачы храма св. Спаса Праваслаўнаму Духоўнаму ведамству. Князь Хаванскі згадзіўся прыняць «горячее участие» у гэтай справе, што, у сваю чаргу, спрыяльна адбілася на далейшым лёсе Спаса-Еўфрасіннеўскага жаночага манастыра ў цэлым і старажытнага помніка праваслаўнай даўніны царквы Спаса, у прыватнасці.

У 1832 годзе, калі былыя езуіцкія пабудовы пачалі выкарыстоўваць пад кадэцкі корпус, піяры былі пераведзены ў іншыя рымска-каталіцкія манастыры, і Спаская царква з усёй маёмасцю была перададзена пад ахову Праваслаўнага духоўнага ведамства [9, с. 5].

Буйнамаштабныя работы па аднаўленню і частковай перабудове Спаскага храма праводзіліся ў 1833–1835 гадах пад кіраўніцтвам архітэктараў А. Порта і К. Лукіна. За вызначаны перыяд былі праведзены буйнамаштабныя работы па аднаўленню і частковай перабудове Спаса-Праабражэнскага храма. У выніку капітальнага рамонту паўразбураны купал царквы набыў форму лукавіны, быў уладкаваны жалезны дах, які па-ранейшаму заставаўся двухсхільным. Да заходняй сцяны будынка быў прыбудаваны прытвор. З усходняга, паўднёвага і паўночнага бакоў старажытныя какошнікі былі схаваны пад напластаваннямі пазнейшай кладкі.

Улічваючы немалады ўзрост архітэктара А. Порта, а таксама яго занятасць над распрацоўкай праекта кадэцкага корпуса, па даручэнню князя Ю. Хаванскага з Магілёва быў вызваны губернскі архітэктар Г. Бусырскі. Па праекту Г. Бусырскага ў храме Спаса Праабражэння ў 1835 годзе на месцы спарахнелага іканастаса быў уладкаваны пазалотны трох’ярусны іканастас, аздоблены новым жывапісам [8, л. 5 – 7].

Казённыя сяляне «поиезуитскаго» маёнтка Спас агульнай колькасцю 700 чалавек пажадалі далучыцца да праваслаўнай веры. З гэтай нагоды былы віцэ-губернатар Віцебска князь С. І. Давыдаў

Рэпазіторый ВДУ

вырашыў, што для правядзення ўрачыстага абрада пасвячэння ў новую веру неабходна як мага хутчэй асвяціць храм св. Спаса і неадкладна правесці набажэнства, «сопроводив в первый раз водоосвящением, крестным ходом и назидательным словом к новообращенным» [8, л. 7].

Да пачатку рамонтна-рэстаўрацыйных работ храм быў часова абсталяваны ўсім неабходным для правядзення набажэнстваў: замест старога даху быў уладкаваны новы гонтавы, выпраўлена падлога, заменены ваконныя шыбы, на заходнім фасадзе былі дэмантаваны дзве маленькія вежы рымска-каталіцкага ўзору, зробленыя яшчэ ў часы езуіцкага знаходжання ў манастыры. Таксама быў выкананы шэраг унутраных і знешніх тынкавых работ «для уничтожения одного безобразия» [6, л. 39]. Невялікі па памерах іканастас быў перанесены з Багаяўленскага мужчынскага манастыра і ўладкаваны рускімі майстрамі, якія ў той час працавалі над узвядзеннем полацкага кадэцкага корпуса. Згодна каштарысу, з казны было выдаткавана 1 177 руб. 30 кап. Асвячэнне храма св. Спаса адбылося 7 жніўня 1833 года пры епіскапе Полацкім і Віленскім Ісідоры (Нікольскім), будучым мітрапаліце Санкт-Пецярбурга [2, с. 17].

На шляху адраджэння манастыра на яго першапачатковым месцы паўстаў шэраг перашкод. У першую чаргу спасылаліся на адсутнасць дастатковай колькасці гаспадарчых збудаванняў на тэрыторыі манастырскага комплексу. Як выйсце – была высунута прапанова адчыніць праваслаўны жаночы манастыр у былым Бернардзінскім кляштары, заснаваным у 1488 годзе па фундацыі вялікага князя Аляксандра Ягелончыка. У адрозненне ад манастыра св. Спаса помнікі мужчынскага манастыра знаходзіліся ў добрым стане: у саборным касцёле бернардзінцаў патрабаваліся нязначныя касметычныя дапрацоўкі і ўсталяванне праваслаўнага іканастаса. Пасля правядзення належных работ манастыр планавалася надзяліць угоддзямі і прылічыць да II класа.

Разам з лёсам жаночага манастыра пытанне ставілася і непасрэдна аб самой Спаскай царкве. Наконт статуса царквы высоўваліся наступныя прапановы:

1. Зрабіць царкву Спаса Праабражэння прыхадской;
2. Заснаваць пры царкве жаночы манастыр II класа з найменнем «Полацкі Спаса-Еўфрасіннеўскі» і вызначыць яму зямельныя ўгоддзі і млын на Юравічах. Пасля вярнуць манастыру св. Спаса мошчы прападобнай Еўфрасінні, Крыж з Сафійскага уніяцкага сабора, Эфескі абраз Багародзіцы ці па прычыне адмовы здзяйсняць хрэсны ход з Тарапца ў Полацкі манастыр з азначанай іконай, альбо зрабіць з яе спіс і ўладкаваць у царкве Спаса.
3. Уладкаванне пры царкве загараднягa архірэйскага дома для «уединенного в летнее время занятия» з фасадам і агародамі і даць



Репозиторий ВГУ

яму назву «Спаская пустынь», а сам жаночы манастыр заснаваць у скасаваным Бернардзінскім манастыры г. Полацка. Такі варыянт быў найбольш выгадны і зручны для ажыцяўлення.

Першапачаткова Св. Сінод прыняў рашэнне зацвердзіць пункты 2 і 3, у той час, як ад першага пункту адразу адмовіліся .

30 красавіка 1833 года кіраванне зноў утворанай полацка-віленскай епархіяй прыняў праасвяшчэнны Смарагд. Не маючы па прыездзе належнага ўласнага памяшкання, уладыка спыніў свой выбар на мястэчку Спас, старажытнай метахіі полацкіх епіскапаў

Да 23 красавіка 1835 года тэрміна, калі арэнда некага Пядзевіча ўсяго паезуіцкага казённага маёнтка Спаса разам з садамі, палямі і агародамі падышла да завяршэння, міністр фінансаў пагадзіўся перадаць вызначаную маёмасць для ўладкавання там архірэйскага дома з мужчынскай пустынню [5, л. 15–17].

Ад 20 ліпеня 1836 года Сінод выдаў распараджэнне, дзе даў сваю згоду на хадайніцтва Смарагда і вызначыў на рэстаўрацыю храма Спаса Праабражэння 30 359 руб. [3, с. 15–17]. Будаўнічая камісія складалася з архімандрыта Багаяўленскага манастыра а. Паісія, протаіерэя Капаевіча і губернскага архітэктара А. Порта.

Падчас кіравання ўладыкі Ісідора Спас ужо састаяў пад кіраўніцтвам архірэйскага эканома. У летнія сезоны 1838–1839 гадоў пад непасрэдным назіраннем епіскапа быў праведзены рамонт Спаскай царквы, а ўжо 30 ліпеня 1839 года храм быў асабіста асвечаны Ісідорам. Хоць 5 жніўня 1839 года архірэйская праваслаўная кафедра і была пераведзена ў Віцебск, Спас працягваў заставацца ў становішчы былой загарадняй архірэйскай рэзідэнцыі. У такім выглядзе былая тэрыторыя старадаўняга манастыра выкарыстоўвалася на працягу 5 гадоў (1835–1840).

Адзначым, што епіскап Гаўрыіл (Гарадкоў) яшчэ ў 1833 годзе адзін з першых высунуў прапанову аб аднаўленні старажытнай Еўфрасінневай абіцелі. Як лічыў праваслаўны іерарх, па той прычыне, што ў Віцебскай губерні няма ніводнага праваслаўнага жаночага манастыра, то магчыма заснаваць такую абіцель «у церкви Спаса». Былыя заветы спачылага епіскапа знайшлі сваё ўвасабленне ў актыўнай дзейнасці ў пераасэнсаванні культу Еўфрасінні праасвяшчэннага Васіля (Лужынскага), які прыняў кіраванне епархіяй 7 ліпеня 1840 года.

План адраджэння манастырскага комплексу свайго папярэдніка Васіль рэалізаваў пры дапамозе Крыжа Еўфрасінні Полацкай, які на той час быў пакладзены ў мурах грэка-уніяцкага Сафійскага сабора [7, с. 73]. Разам з крыжом-рэлікварыем у суправаджэнні архімандрыта Полацкага Багаяўленскага манастыра а. Філарэта Праасвяшчэнны накіраваўся ў Маскву, дзе знаходзіўся тры тыдні, а пасля і Санкт-Пецярбург.

Рэпазіторый ВДУ

Шэдэўр эмальернага мастацтва аўтарства Богшы ўбачыў расійскі імператар Мікалай I (1825–1855), які пасля загадаў адрадзіць старажытны манастырскі ансамбль у Полацку. Указам Мікалая I ад 18 кастрычніка 1841 года было загадана перавесці полацкі жаночы манастыр у Спас і аддаць у яго непасрэднае валоданне Спаса-Праабражэнскі храм [2, с. 13].

Паводле царскага ўказу 1841 года, у Сяльцы пачынае дзейнічаць першакласны жаночы манастыр са штатам, якому пры 1 настаяцельніцы палагалася 13 манашак, 5 паслушніц, адзін святар, псаломшчык і панамар [4, л. 23]. Згодна рэзалюцыі Васіля Лужынскага ад 30 лістапада 1841 года была прызначана камісія, якая абавязвалася «немедленно» перавесці манахінь у Еўфрасіннеўскую абіцель. Пасля выканання загаду, непасрэдна 23 мая 1842 года, прымеркаванага да дня памяці Еўфрасінні Полацкай, пад муры Спаса-Праабражэнскага храма, у келлю прападобнай ігуменні быў урачыста перанесены Крыж.

Спаса-Еўфрасіннеўскі жаночы манастыр, атрымаўшы з 1842 года статус першакласнага, пачаў атрымліваць добрае штогадовае забеспячэнне з дзяржаўнай казны. Аднак нягледзячы на шэраг станоўчых перамен у статусе і забудове манастырскага комплексу, абіцель працягвала выглядаць горшым чынам. Заняпалае становішча манастыра, якое працягвалася з моманту аднаўлення абіцелі да часоў кіравання ігуменні Яўгеніі (Гаваровіч), большасць царкоўных даследчыкаў дакастрычніцкага перыяду тлумачыла працяглым безманастырскім этапам «паезуіцкіх» часоў. Да таго трэба падкрэсліць, што ідэя ўладкавання на тэрыторыі Спасава манастыра архірэйскага дома больш не высоўвалася, што само па сабе было станоўчым фактам для паступовага развіцця сацыяльна-эканамічнага і культурна-рэлігійнага базісу жаночай абіцелі.


1. Довгялло, Д. И. Перенесение св. мощей преп. Евфросинии из Киева в Полоцк / издание поч. чл. Полоцкого церк. братства во имя свят. Николая и преп. Евфросинии Дм. Ив. Довгялло. – Вильна : Полоцкое церковное братство, 1910. – 80 с.
2. Дубровский, М. Житие преподобной Евфросинии, княжны Полоцкой, с кратким описанием основанного ею в г. Полоцке женского монастыря и находящейся в нем святыни / священник Михаил Дубровский. – Полоцк : издание Полоцкого церковного братства во имя св. Николая и пр. Евфросинии, княжны Полоцкой, 1885. – 34 с.
3. Монастырь у церкви Спаса: Полоцкий Спасо-Евфросиниевский монастырь с древности до наших дней. – Минск : Орех, 2007. – 136 с.
4. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). Ф. 2563. – Воп. 1. – Спр. 6.
5. НГАБ. – Ф. 2694. – Воп. 1. – Спр. 26.
6. НГАБ. – Ф. 2694. – Воп. 1. – Спр. 535.
7. Православные монастыри на Беларуси. – Минск : Четыре четверти, 2003. – 200 с.
8. Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў (РДГА) Письмо Его императорскому Величеству от Министра Внутренних Дел Департамента Духовных Дел Иностранных Исповеданий от 9 апреля 1832 года. – Ф. 797. – Воп. 6 – Спр. 22832. 5,7




Репозиторий ВГУ

9. Сапунов, А. П. Полоцкий Спасо-Ефросиньевский девичий монастырь / А. П. Сапунов. – Витебск, 1888. – 11 с.
10. Шейкин, Г. Н. Полоцкая епархия: Историко-статистическое обозрение / Г. Н. Шейкин. – Минск : Белорусское православное братство трех виленских мучеников, 1997. – 96 с.

**Власова Н.В.**

## ЧИНОВНИЧЕСТВО И СОХРАНЕНИЕ ИСТОРИКО-КУЛЬТУРНОГО НАСЛЕДИЯ (на материалах Рязанской губернии XIX в.)

Рязань, Российская Федерация

Рязанский край обладает богатым историко-культурным наследием, благодаря которому регион имеет прекрасные возможности для развития культурно-познавательного туризма. Важной составляющей наследия являются народные художественные промыслы. В XIX – начале XX вв. в Рязанской губернии были развиты гончарный и вышивальный промыслы, ткачество, лозоплетение, кружевоплетение.

Особым временем для развития кружевного промысла стала вторая половина XIX в. В 1883 г. в Петербурге по инициативе Софьи Александровны Давыдовой была основана Мариинская практическая школа кружевниц. Это было первое в России профессиональное женское учебное заведение. Кроме этого, С.А. Давыдова способствовала открытию кружевных школ в губерниях России. Одна из них была учреждена и в Рязанской губернии. Инициатива создания школы, принадлежавшая частному лицу, была поддержана местной властью. Следует сказать, что в любом задуманном предприятии всегда была велика роль и значение чиновников местной губернской администрации. От них зависела дальнейшая судьба какого-либо начинания, в их власти было приостановить дело или, наоборот, дать ему ход. Особую роль играла личность губернатора.

Рязанский губернатор Николай Семенович Брянчанинов (1893–1904) представляет собой яркий пример чиновника, чья созидательная деятельность осталась в памяти потомков. Он не раз помогал тем, кто обращался к нему просьбой оказать поддержку и содействие в тех или иных начинаниях. Н.С. Брянчанинов за годы своего руководства губернией многое сделал для сохранения и приумножения культурного наследия Рязанской губернии, в том числе и для развития кружевоплетения.

В начале декабря 1894 г. землевладелица Скопинского уезда Рязанской губернии Екатерина Николаевна Половцова обратилась в Министерство земледелия и государственных имуществ с ходатайством о разрешении ей учредить в её имении школу кружевниц, «с целью развития и улучшения местного кустарного кружевного произ-



Репозиторий ВГУ